**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль народных інструментаў «Верас» дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў №5 г. Гомеля»**

Ансамбль народных інструментаў «Верас» быў заснаваны ў 1994 годзе. Мэтай і задачамі калектыву сталі павышэнне выканаўчага ўзроўня педагогаў школы, іх патрабаванне ў творчай самарэалізацыі, папулярызацыя народных інструментаў, прапаганда сярод насельніцтва лепшых узораў класічнай, народнай і папулярнай музыкі айчынных і замежных аўтараў, актыўны ўдзел у гарадскіх, раённых і абласных канцэртных мерапрыемствах, абслугоўванне сельскага гледача.

Першым крокам да дасягнення мэты было тое, што ў 1997 годзе ансамбль становіцца лаўрэатам I абласнога конкурсу аркестраў, ансамбляў струнных народных інструментаў «Мелодыі роднага краю » імя Г. Жыхарава. Гэтаму поспеху ў немалой ступені садзейнічаў прыход у калектыў маладых, таленавітых выкладчыкаў-выканаўцаў.

З верасня 1997 года кіраўніком ансамбля народных інструментаў «Верас» становіцца высокакваліфікаваны педагог Гомельскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў імя Н.Ф. Сакалоўскага – Трафімовіч Анатоль Мікалаевіч – ініцыятыўны, адказны, улюблёны ў сваю справу і аддany ёй прафесіянал. Вялікай павагі заслугоўвае яго актыўная творчая дзейнасць у спалучэнні з педагагаічнай работай. Гэта дазваляе бачыць у ім аднаго з вядучых спецыялістаў па класу домры ў нашай краіне, які мае вялікі аўтарытэт у педагагічным асяроддзі. З яго прыходам узрос арганізацыйны, мастацкі, прафесійны ўзровень работы калектыву, больш разнастайным стаў рэпертуар. Ансамбль пашырыў сваю канцэртную дзейнасць: у перыяд з 1998 па 2001 гады ён даў больш за 50 канцэртаў.

У 1999 годзе на падставе пастановы калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь №7 п.9 ад 30.09.1999 г. ансамбль народных інструментаў «Верас» за дасягнутыя поспехі ў развіцці самадзейнай творчасці, актыўную работу па прапагандзе народных традыцый атрымлівае ганаровае званне «народны самадзейны калектыў».

Калектыў пашырае сваю канцэртную біяграфію, прымае актыўны ўдзел у мерапрыемствах школьнага, раённага, гарадскога, абласнога ўзроўняў. Дзякуючы свайму багатаму, разнастайнаму рэпертуару, арыгінальнаму мастацкаму ажыццяўленню вобразаў ў творах, «Верас» становіцца пастаянным удзельнікам гарадскіх, абласных, рэспубліканскіх святаў. Сольныя канцэрты ансамбля збіраюць шырокую ўдзячную аудыторыю слухачоў. Тут асаблівую ролю іграе і маральная пазіцыя калектыву: радаваць гледачоў сваёй творчасцю, садзейнічаць развіццю яго мастацкага густа, прысвячаць сябе высокай культурнай місіі адукацыі і выхавання. Акрамя таго, прафесіяналізм калектыву падкрэсліваецца арыгінальным падборам рэпертуару, непаўторным стылем і віртуознасцю выканання, уменнем дакладна перадаць задуму кампазітара.

У 2014 годзе на падставе пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь №20 п.1 ад 24.04.2014 г. ансамбль народных інструментаў «Верас» за дасягнутыя поспехі ў развіцці самадзейнай творчасці, актыўную работу па прапагандзе народных традыцый атрымлівае ганаровае званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

Сваю перспектыву ўдзельнікі калектыву бачаць у далейшай прапагандзе высокіх узораў класічнай і народнай музыкі, у вялікім служэнні беларускай нацыянальнай культуры і мастацтву, беларускаму народу.

